КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ

# Неканстытуцыйны захоп улады: чаму А. Лукашэнка павінен быць адхілены ад удзелу ў выбарах 2025 года

[ Канферэнцыя Новая Беларусь 03-04 Жніўня 2024 ]

## *Заява дэмакратычных сіл Беларусі*

Мы, дэмакратычныя сілы Беларусі, заяўляем, што надыходзячыя прэзідэнцкія выбары 2025 года з'яўляюцца не больш чым чарговай імітацыяй.

Аляксандр Лукашэнка, які ўтрымлівае ўладу злачынным спосабам, не павінен быць дапушчаны да ўдзелу ў гэтых выбарах. Чарговая імітацыя выбараў не можа быць прызнаная канстытуцыйным спосабам фармавання ўлады ў Беларусі, бо Лукашэнка знаходзіцца ва ўладзе ў тры разы даўжэй, чым гэта дазваляе беларуская Канстытуцыя.

***У 1996 годзе Аляксандр Лукашэнка неканстытуцыйным спосабам змяніў канстытуцыю Беларусі, учыніўшы дзяржаўны пераварот.*** Увядзенне новай канстытуцыі надзяліла яго аўтарытарнымі паўнамоцтвамі. Гэтыя падзеі сталі пачаткам ізаляцыі Беларусі ад міжнароднай супольнасці.

***У 2020 годзе выбары выйграла Святлана Ціханоўская***, аднак А.Лукашэнка працягнуў утрымліваць уладу сілавым спосабам, у чарговы раз ажыццявіўшы неканстытуцыйны захоп улады.

На працягу ўсяго праўлення А.Лукашэнкі ў Беларусі сістэматычна душыліся правы і свабоды чалавека. Учыняліся палітычныя забойствы, першымі ахвярамі якіх сталі Юрый Захаранка, Віктар Ганчар і Аляксандр Красоўскі. Пасля падзей 2020 года колькасць ахвяр і злачынстваў супраць чалавечнасці значна ўзрасла. Рэпрэсіі ўзмацніліся, уключаючы масавыя затрыманні, катаванні і жорсткае абыходжанне са зняволенымі. Былі ліквідаваныя апазіцыйныя палітычныя партыі, арганізацыі грамадзянскай супольнасці, незалежныя сродкі масавай інфармацыі, а таксама свабода мірных сходаў.

Падтрымка Расіі стала другім пасля рэпрэсій значным фактарам, які дазволіў А.Лукашэнку незаконна ўтрымліваць уладу. На працягу ўсяго свайго праўлення А.Лукашэнка падтрымліваў цесныя адносіны з Расіяй, паступова здаючы суверэнітэт Беларусі. Гэты працэс суправаджаўся знішчэннем беларускай мовы і культуры, а таксама павелічэннем залежнасці ад Расіі.

Рэжым Лукашэнка стаў суагрэсарам, падаўшы тэрыторыю Беларусі як плацдарм для ўварвання расійскіх войскаў ва Украіну. Сам Лукашэнка датычны да гвалтоўнага перамяшчэння ўкраінскіх дзяцей у Беларусь, дзе яны падвяргаюцца русіфікацыі і ідэалагічнай апрацоўцы, што з'яўляецца ваенным злачынствам.

Мы заклікаем міжнародныя арганізацыі і грамадскасць не прызнаваць вынікі маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбараў 2025 года ў Беларусі. Гэтыя выбары з'яўляюцца імітацыяй і не адлюстроўваюць сапраўднай волі беларускага народа.

*Прынята на Канферэнцыі Новай Беларусі*
*г. Вільнюс, 3-4 Жніўня 2024*